ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# ДЗЕДЗІЧ

ДЗЕДЗІЧ
Зберагчы і памяльшцы

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

№ 2 (27)
САКАВІК 2004

2 БРСМ ЦІ «ЗУБР». МОЛАДЗЬ ВЫБІРАЕ ПЕРАМЕНЫ.
4 АДЗІН КРОК ДА ВАЙНЫ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І ЛІТВОЙ
6 Я ТАБЕ З-ПАД ШЫБЕНІЦЫ КАЖУ, НАРОД... Разважанні з нагоды сумнай даты
8 КІСЕЛЬ І МЕДАВУХА. Як прыгатаваць беларускія напоі

# СА СВЯТАМ ЦЯБЕ, БЕЛАРУСЬ!



Фота: ByMedia.net

## ШАНОЎНЫЯ БЕРАСЦЕЙЦЫ!

**Віншуем Вас з вялікім нацыянальным святам нашай краіны!**

25 сакавіка Беларусь адзначае найвялікшае свята ў сваёй тысячагадовай гісторыі. У гэты дзень у 1918г. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі абвясціла Беларусь **«незалежнай і вольнай дзяржавай»**. Беларусы заявілі на ўвесь свет, што яны жадаюць будаваць свой дом, што яны вартыя называцца народам.

З таго часу мінула шмат гадоў. Шмат пакут і выпрабаванняў выпала на долю беларускага народа. І нашы бацькі і дзяды паказалі, што яны вартыя «Людзьмі звацца»!

Сённяшні рэжым ізноў ставіць беларускі народ на мяжу выжывання. Нізкія заробкі, рост камунальных тарыфаў, беспрацоўе, ціск на прадпрымальнікаў, замоўчванне чарнобыльскіх праблем – у такіх умовах добра жывуць толькі чыноўнікі з прэзідэнцкай «вертыкалі». Адсутнасць перспектыў на лепшую будучыню вядзе да таго, што 70% моладзі марыць з'ехаць за мяжу. **А хто застанецца тут?!**

**Верым, што і сёння мы здольныя адстаяць незалежнасць краіны, каб мець будучыню – у свабоднай квітнеючай Беларусі.**

**ДА ЛЕПШАГА ЖЫЦЦЯ – ПРАЗ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ!**

## ШАНОЎНЫЯ БЕРАСЦЕЙЦЫ!

**– Калі Вы падзяляеце нашыя погляды на сучасную сітуацыю ў Беларусі і нашыя надзеі на будучыню,**

**– калі Вы жадаеце супрацоўнічаць з намі, стаць сябрамі "Сузор'я" ці проста перадаць цікавую інфармацыю,**

**паведамляем, што звязацца з намі можна праз распаўсюджвальнікаў нашай газеты, альбо па тэл.: 20-57-41 з 18.00 да 21.00.**
**Маб.: (029) 660-57-41, (029) 725-15-39.**

**МЫ ЧАКАЕМ ВАС!**

**Прэс-служба БАМГА "Сузор'е"**

# БНР – БОГ, НАРОД, РАДЗІМА

У ГОНАР СВЯТА ДНЯ ВОЛІ 25 САКАВІКА РЫГОР БАРАДУЛІН НАПІСАЎ ВЕРШ ПРА БНР.

***Рыгор Барадулін***

***

БНР –
Бог, Народ, Радзіма.
БНР –
Быць Надзеі Ранішняй!
У змаганцаў перад вачыма
Беларушчыны сэрца параненае.

Разгараецца на суравеях стагоддзяў
Бел-Чырвона-Белае полымя,
Кладкі палячы здрадлівай згодзе.
Вернасць і непахіснасць супольныя.

Рве свабода варожыя сковы,
Прэчыць крылы зграяў абскублыя.
Санцавеецца воблік вясновы
Беларускай Народнай Рэспублікі!

## АДНЫМ РАДКОМ

### НАВІНЫ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ – У ЭЛЕКТРОННАЙ РАССЫЛЦЫ

Фонд "Дзедзіч" распачаў выпуск электроннай рассылкі Dzedzich week-news з навінамі жыцця моладзевых арганізацый (МА) Берасцейшчыны. Таксама ў рассылцы змяшчаецца інфармацыя аб адукацыйных праграмах, семінарах, аб'явы аб конкурсах праектаў і стыпендый і, безумоўна, крыху гумару.

Рассылка будзе штотыднёвай, але чым больш будзе навін, тым часцей яна будзе выходзіць. Просім усе МА дасылаць нам інфармацыю пра свае мерапрыемствы – былыя і планаваныя.

Падпісацца на рассылку можа любы жадаючы.

Трэба толькі даслаць ліст на адрас: dzedzich@mail.ru.

**Dzedzich week-news**

### ЗАНЯДБАНАЯ СПАДЧЫНА



Ініцыятыўная група моладзі, прадстаўнікі БАМГА «Сузор'е», студэнты і выкладчыкі БрДУ атрымалі адказ гарвыканкама аб падтрымцы іхняга праекта кансервацыі руін былога кляштара бернардзінак, што знаходзіцца на Шпітальным востраве Берасцейскай крэпасці.

Праект прадугледжвае збор сродкаў грамадзян, прадпрыемстваў і ўстаноў на кансервацыю будынку кляштара – адзінага будынку, што захаваўся з часоў старога Берасця.

У адказе (які, дарэчы, напісаны па-беларуску!), у прыватнасці, выказваецца падзяка «за праведзеную працу, за падтрыманне парадку на гэтай гістарычнай зямлі». І хаця змест адказа даволі расплывісты, моладзь пачала рыхтавацца да збору сродкаў на кансервацыю. А ўлетку плануецца правядзенне летніка па ачысткі рэштак кляштара ад смецця і раслін. Адзін з ініцыятараў праекта, кіраўнік БАМГА «Сузор'е» Д.Шыманскі кажа:

– Як калісьці, 4 гады таму, мы разаб'ем на Шпітальным востраве 2-хтыднёвы летнік і будзем сумяшчаць прыемнае з карысным – днём працаваць на ачысткі кляштара, а ўвечары адпачываць – купацца, спяваць пад гітару, весці няспешныя размовы ля вогнішча. Дарэчы, хачу запрасіць у летнік усіх, каму неабыякава наша гістарычная спадчына. Шкадаваць аб згубленым часе не будзе ніхто.

**Dzedzich week-news**

**Шаноўныя сябры!**
**Рэдакцыя "Дзедзіча" з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет у сярэдзіне красавіка 2004 г.**
**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 20-57-41 да 10.04.04.**

# БРСМ ИЛИ

## 120 ЧЛЕНОВ БРСМ ПЕРЕШЛИ В "ЗУБР"

ОДНА ИЗ ОРГАНИЗАЦИЙ ОФИЦИАЛЬНОЙ МОЛОДЕЖНОЙ СТРУКТУРЫ – БЕЛОРУССКОГО РЕСПУБЛИКАНСКОГО СОЮЗА МОЛОДЕЖИ – ГОРОДА БАРАНОВИЧИ ПРИСОЕДИНИЛАСЬ К МОЛОДЕЖНОМУ ОППОЗИЦИОННОМУ ДВИЖЕНИЮ "ЗУБР".

Решение было принято на общем собрании членов БРСМ Барановичского государственного колледжа легкой промышленности имени В.Чернышева. Эта организация – одна из крупнейших в городе, она включает более сотни человек.

Собрание прошло вечером 2 марта в актовом зале одного из студенческих общежитий. Первым вопросом на нем рассматривалось предложение ряда членов БРСМ о присоединении к "Зубру".

После непродолжительного обсуждения его поддержало абсолютное большинство участников собрания. Только шесть человек воздержались во время голосования. Ни одного голоса "против" подано не было. Новые участники "Зубра" получили значки с логотипом движения.



**Общее собрание членов БРСМ Барановичского государственного колледжа лёгкой промышленности, на котором было принято решение о присоединении к движению «ЗУБР»**

Подобный факт не вызывает особого удивления. Общеизвестно, что большинство "союзной молодежи" являются либо гоголевскими "мертвыми душами", либо вступили в ряды БРСМ под влиянием вышестоящих инстанций (учителя, преподаватели, культорганизаторы). На фоне случившегося особое внимание привлекают факты при-

**(субота)**
**$12^{00}$**
***стадыён «БУДАЎНІК»***
**(вул. Ленінградская, 2. Праез трал. №3, 4, 7 да прып. «Малочны камбінат»)**

# Мітынг

# БЕЛАРУСКАМУ НАРОДУ – ДАСТОЙНАЕ ЖЫЦЦЁ!

**Запрашаем Вас прыняць удзел у святочным мітынгу, які адбудзецца на стадыёне «Будаўнік» 27 сакавіка ў 14-00.**

**У ПРАГРАМЕ МІТЫНГУ:**

- **выступы лідэраў палітычных партый, аб'яднаных у Народную кааліцыю «Пяцёрка плюс»: С. Шушкевіч, В. Вячорка, С. Калякін, А. Лябедзька, А. Бухвостаў.**
- **песні ў выкананні барда Андруся Мельнікава (Гомель).**

**НАС З ВАМІ – БОЛЬШАСЦЬ!**

**Народная кааліцыя «Пяцёрка плюс», г. Берасце**

На правядзенне мітынгу атрыманы дазвол гарвыканкама.

# ЗУБР

нудительно-добровольного массового вступления молодежи в ряды «патриотов». Будем надеяться, что явление массового перехода "нячэснай" молодежи в организацию, отличную от БРСМ, откроет отрицавшийся ранее факт "прыгнёту" со стороны «сознательных» органов. А иначе как можно объяснить сложившуюся ситуацию?

Это событие комментирует Никита Сасим, руководитель организации БРСМ в колледже:

– Молодежь, которую сегодня силой загоняют в БРСМ, понимает, что ее обманывают. Большинство участников этой организации осознает, что власть просто использует их в своих интересах. Никаких перспектив, возможностей для самореализации у рядового члена БРСМ нет. Все, что сегодня имеют члены организации, сводится к ряду льгот и бесплатных дискотек. Но молодежь не стремится к льготам. Мы хотим играть более серьезную роль в общественно-политической жизни страны. Идея присоединения к "Зубру", как к наиболее организованному и сильному движению, возникла несколько месяцев назад. Мы обсуждали ее в узком кругу, встречались с учениками других заведений. Мы уверены в том, что это правильное решение.



**Акции солидарности с молодёжью Барановичского колледжа провели члены движения «ЗУБР» в разных городах. На фото: активисты ЗУБРа в г. Борисове сжигают агитационную продукцию БРСМ.**

В конце собрания его участники приняли обращение к другим ячейкам БРСМ с призывом поддержать "Зубр" и присоединиться к его деятельности.

**charter97.org**




**Правядзенне мітынга падтрымана Народнай кааліцыяй «Пяцёрка плюс».**
**Калі Вы жадаеце больш ведаць аб ёй, звяртайцеся па тэл. у г. Берасці:**

| | |
|---|---|
| **Аб'яднаная грамадзянская партыя –** | (029) 642-29-34 |
| **Беларуская партыя працы –** | 45-97-40 |
| **Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада –** | 44-37-50 |
| **Партыя БНФ –** | 25-70-55, (029) 660-57-41 |
| **Партыя Камуністаў Беларуская –** | (029) 620-77-67 |


## АДНЫМ РАДКОМ

### «ДЗЕЯСЛОЎ» У БРДУ



У чацвер, 18 сакавіка ў старым корпусе БрДУ адбылася сустрэча берасцейскіх студэнтаў з рэдакцыяй часопіса "Дзеяслоў".

У Берасце завіталі галоўны рэдактар выдання, празаік Барыс Пятровіч (Сачанка), паэт і бард Эдуард Акулін, старшыня СП Беларусі Алесь Пашкевіч. Госці прэзентавалі апошнія нумары адносна новага (на літаратурным рынку часопіс існуе 1 год) беларускага літаратурна-мастацкага выдання "Дзеяслоў".

Часопіс быў створаны людзьмі, якія па сваіх маральных меркаваннях не хацелі супрацоўнічаць з афіцыйнымі літаратурнымі выданнямі ("Маладосць", "Полымя", "Крыніца" і інш.). Зараз вакол часопіса гуртуюцца лепшыя літаратурныя сілы: Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Вольга Іпатава, Уладзімер Арлоў, Адам Глобус і інш. "Дзеяслоў" - ледзьве не адзінае (побач з "Arche") на сённяшні дзень рэгулярнае выданне, дзе творца можа надрукавацца незалежна ад сваіх палітычных, эстэтычных ды іншых поглядаў.

Госцем сустрэчы быў вядомы берасцейскі паэт Алесь Каско, які прачытаў колькі сваіх апошніх вершаў, а таксама новых перакладаў з македонскай мовы. Барыс Сачанка прадставіў некалькі ўрыўкаў прозы з трыпціху "Экспрэс", чытаў вершы і спяваў свае песні Эдуард Акулін, колькі апошніх вершаў прадставіў на суд слухачоў і Алесь Пашкевіч.

**Dzedzich week-news**

### СУСТРЭЧА З ЗЕМЛЯКОМ

У пятніцу 19 сакавіка ў навукова-асветніцкім цэнтры імя У.Калесніка адбылася сустрэча з вядомым беларускім паэтам Васілём Жуковічам. ¨н прывёз сваю кніжку "У храме харaства і смутку", якую можна было набыць з аўтографам, а таксама аўдыёкасету з песнямі на ўласныя вершы. Была зроблена выстава фотаздымкаў "Фотапачуцці Васіля Жуковіча", аўтарам якой з'яўляецца сам паэт.

Самыя чытанні вершаў паэта суправаджаліся перапынкам на слуханне песен.

На сустрэчу завіталі берасцейскія паэты Мікола Пракаповіч, Іван Мельнічук, Кастусь Жмінько. Пра паэта было сказана шмат добрых цёплых словаў. Сам жа ён падаўся прысутным вясёлым, даверлівым і аптымістычным чалавекам.

Падчас сустрэчы панавала вельмі добрая аўра, напэўна, з-за таго, што сцены філалагічнага факультэта родныя для Васіля Жуковіча, які калісьці таксама вучыўся на філфаку БрДУ.

**Dzedzich week-news**

# АДЗІН КРОК ДА ВАЙНЫ

МЫ ДРУКУЕМ МАЛАВЯДОМУЮ ЗАЯВУ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР АД 1 КРАСАВІКА 1990г., ЯКАЯ МАГЛА СПРАВАКАВАЦЬ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНУЮ ВАЙНУ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І ЛІТВОЙ. ЗАЯВА ВЫКЛІКАЛА ДЫПЛАМАТЫЧНЫ СКАНДАЛ І МАЛА ЗАСТАВАЛАСЯ ДА ПАЧАТКУ ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ. ПАКІДАЮЧЫ ГЭТЫ МАТЭРЫЯЛ БЕЗ КАМЕНТАРЫЯ, ПРОСІМ ЧЫТАЧА ПАДУМАЦЬ, НАКОЛЬКІ АДПАВЯДАЕ ЯЕ ТЭКСТ РЭАЛІЯМ СУЧАСНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ.

## ЗАЯВА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай рэспублікі лічыць неабходным заявіць Вярхоўнаму Савету Літоўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі наступнае.

Тым, хто робіць у Літве спробы па ўвядзенню ў дзеянне Канстытуцыі Літвы ад 12 мая 1938 года, трэба ўлічваць, што ў 1938 годзе тэрыторыя Літоўскай рэспублікі была зусім іншай, і толькі ў выніку рашэнняў вышэйшых органаў Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік Літоўскай рэспубліцы і Літоўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы былі перададзены спрадвечна беларускія тэрыторыі. Пры выхадзе Літоўскай ССР з Саюза ССР Беларуская ССР не будзе лічыць сябе звязанай усімі законамі, указамі і іншымі актамі адносна перадачы Літве часткі беларускіх зямель.

Акты па тэрытарыяльных пытаннях паміж Беларускай ССР і Літоўскай ССР грунтаваліся на Законе Вярхоўнага Савета СССР ад 3 жніўня 1940 года "Аб прыняцці Літоўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік", які цяпер у аднабаковым парадку аб'яўлены літоўскім бокам несапраўдным.

Тым самым ён бярэ на сябе адказнасць за тое, што страчваюць сваю сілу пункт 2 указанага Закона Вярхоўнага Савета СССР ад 3 жніўня 1940 года адносна перадачы Літоўскай ССР Свянцянскага раёна і часткі тэрыторы Відзаўскага, Гадуцішкаўскага, Астравецкага,

**БЕЗ КАМЕНТАРЫЯЎ**

Воранаўскага і Радунскага раёнаў Беларускай ССР, а таксама адпаведнае прадстаўленне Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР і Прэзідыума Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР і прыняты на гэтай аснове Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 лістапада 1940 года "Аб устанаўленні граніц паміж Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай і Літоўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай".

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР у выпадку выхаду Літоўскай ССР з СССР будзе вымушаны перагледзець прынятыя ім рашэнні аб адміністрацыйна-тэрытарыяльнай будове адпаведных абласцей Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якія вынікалі з названых вышэй актаў.

Акрамя таго, улічваючы заяву літоўскіх улад аб іх негатоўнасці захоўваць у поўным аб'ёме "Дагавор аб перадачы Літоўскай рэспубліцы горада Вільня і Віленскай вобласці і аб узаемадапамозе паміж Савецкім Саюзам і Літвой", заключаны 10 кастрычніка 1939 года паміж Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР і Прэзідэнтам Літоўскай рэспублікі, паўстае пытанне і адносна захавання ў сіле прадугледжаных у ім тэрытарыяльных змяненняў у карысць Літвы.

Указаны дагавор, акрамя іншага, закрануў інтарэсы беларускага насельніцтва, якое пражывае на гэтай тэрыторыі, што знаходзілася з другой палавіны верасня 1939 года пад савецкай юрысдыкцыяй. ¨н быў заключаны без паведамлення і згоды Беларускай ССР.

Акрамя таго, не трэба забываць, што заключэнне гэтага дагавора вынікае з сакрэтных дагаворанасцей у сувязі з савецка-германскім дагаворам аб ненападзе ад 23 жніўня 1939 года, які, як указана ў пастанове З'езда народных дэпутатаў Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік ад 24 снежня 1989 года, у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права страціў сілу ў момант нападу Германіі на СССР, гэта значыць 22 чэрвеня 1941 года. З'езд народных дэпутатаў СССР таксама асудзіў факт падпісання "сакрэтнага дадатковага пратакола" да дагавора ад 23 жніўня 1939 года і іншых сакрэтных дагаворанасцей з Германіяй. З'езд прызнаў сакрэтныя пратаколы юрыдычна беспадстаўнымі і несапраўднымі з моманту іх падпісання.

У сувязі з выкладзеным мы будзем вымушаны настойваць на вяртанні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы беларускіх зямель.

**Прэзідыум Вярхоўнага Савета**
**Беларускай ССР**
**29 сакавіка 1990 года**

**Надрукавана ў газеце "Звязда",**
**1 красавіка 1990 г.**

ВНИМАНИЕ!

# МЫ ПРИГЛАШАЕМ ВОЛОНТЁРОВ

## ДЛЯ ПОДДЕРЖКИ ДЕМОКРАТИЧЕСКИХ КАНДИДАТОВ НА ПАРЛАМЕНТСКИХ ВЫБОРАХ 2004г.

**– Вас не устраивает ситуация в стране, но вы верите, что её можно изменить;**
**– Вы устали верить обещаниям Лукашенко и поддерживаете демократическую оппозицию;**
**– Вы желаете внести свой вклад в возрождение независимой и процветающей Беларуси;**
**– Вам больше 18 лет, и вы можете посвятить часть своего времени избирательной кампании;**
**– Вы хотите приобрести навыки общения с людьми, умения убеждать, взглянуть на выборы изнутри: не как простой избиратель, а как активный участник событий –**

# НАМ НУЖНА ВАША ПОМОЩЬ!

**МЫ ОБЕЩАЕМ:**
**– проведение для вас образовательных семинаров, стажировок как в г. Бресте, так и в других городах и странах;**
**– обеспечение вас всеми необходимыми навыками ведения эффективной агитации;**
**– предоставление возможности продолжить свою политическую карьеру при нашей поддержке;**
**– создание дружеской атмосферы и знакомство с интересными людьми.**

**ЧТО МОЖНО ДЕЛАТЬ: сбор подписей, распространение листовок, расклейка плакатов, агитация, участие в создании предвыборной программы, наблюдение за выборами.**

## НАШИ КАНДИДАТЫ ПРОСЯТ ВАШЕЙ ПОДДЕРЖКИ!

**ЗВОНИТЕ НАМ В ЛЮБОЕ ВРЕМЯ ПО ТЕЛ:**
**25-70-55, (029) 660-57-41, (029) 725-15-39, 41-12-00, 20-57-41, 25-70-55.**

**Брестскя городская организация Партии БНФ**

**ДАРЭЧЫ**

Паймалі папуасы беларуса, немца і амерыканца. Сказалі, што калі хто-небудзь з іх скажа такое слова, якога яны не ведаюць – адпусцяць, ну а не – пойдзе на камбікорм!

Немец падумаў і кажа:

– Мабільнік!

Папуасы ў бок адыйшлі, пашушукаліся, падыходзяць:

– Гэта, кажуць, такая штучка з гузікамі - ты на іх націскаеш і пасля можаш з сябрам размаўляць!

З'елі немца.

Амерыканец падумаў-паразважаў: добра, мабільнікі з сабой народ цягае - бачылі. А ну-ка:

– Кампутар!, – кажа.

Папуасы ў бок адыйшлі, пашушукаліся, падыходзяць:

– Гэта такая скрынка, ў якой можна літары друкаваць і ў забавы гуляць!

З'елі і амерыканца.

Беларус зразумеў, што прападае і кажа:

– КДБ!

Папуасы ў бок адыйшлі, пашушукаліся, падыходзяць:

– Не ведаем! Ідзі сваёй дарогай. Але спачатку патлумач нам, што гэта такое!

Беларус:

– Ды гэта такія ж падонкі як і вы! Адыйдуць, пашушукаюцца – і няма чалавека!

# МУЗЫКА АПОШНЯЯ ПАКУТЫ...

Мы працягваем змяшчаць на старонках нашага выдання творы маладых літаратараў, на якія так багата берасцейская зямля. Калі Вы жадаеце атрымаць аб'ектыуную адзнаку сваёй творчасці або проста Вам няма з кім падзяліцца сваімі літаратурнымі дасягненнямі – звяртайцеся да нас. Будзем радыя "прычыніцца" да запальвання новых літаратурных зорак. А пакуль, знаёмцеся:

**Галіна Жукава.** Нарадзілася 5 лістапада 1983г. у Берасці. Скончыла філалагічнае аддзяленне ліцэя №1 у 2001г. Зараз студэнтка 3 курса факультэта замежных моў Берасцейскага дзяржаўнага універсітэта. Сябра літаратурнага аб'яднання "Станаўленне".

Вы Гёссэ...
У Вас мільёны Качівлій
Вы, нават, мяне пасялілі ў адной.
Вы гінулі, Вы за мяне памiралі
І кожную смерць называлі Гульнёй.

Вы Моцарт...
Кахання майго бастыёны
Аднойчы былі зруйнаваныя ўшчэнт,
Калі па-над імі праймчаў утрапёна
На крылах сімфоніі Двертысмент.

## МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ

Зімовая ноч...
Вы ў пакої халодным,
І раптам становіцца сэрцу цяплей
Ад ціхае думкі, што Вы – мой палонны,
Мой праведны Герман
І мой Амадэй.

### ЛЮТЫ

I

Размаляваў у шэры ўсе
Дамы са слязлівымі вокнамі
Люты-мастак, ашчэрыўся,
Бліснуў ледзякамі самотнымі.

Тыя маўкліва здрадзілі
Разяўленым Лютавым бліскавіцам –
Плакалі на Генадзія
Ды зніклі зусім на Паўзімніцу.

Расквартаваны слотаю
У цемных завулках і дворыках,
Люты пачаў з неахвотаю
Павольныя зборы і зборыкі...

Перетварыў у забалаць
Палі і дарогі за горадам,
Ворага каб не радаваць –
Вясну з яе цёплымі ордамі...

Люты памер уверсе, і
Няма ні сняжынкі, ні лужыны,
Толькі сляды дыверсіі
У голасе чымсьці прастужаным.

II

Люты б'е па клавішах Зімы,
Бела-чорны, брудна-шэры Люты,
Як аблокі, тонкі і сівы,
Дыхае вясноваю атрутай,
Люты б'е па клавішах Зімы.

¨н дрыжыць струной Сакавіка,
Песняй плача-льецца добры Люты,
Растае ў нябёсаў на руках,
Кімсьці вельмі блізкім не пачуты,
¨н дрыжыць струной Сакавіка.

Люты дзьме ў жалейку Пачуцця.
Музыка апошняя пакуты
Памірае ў дахаў на грудзях.
У кайданы мокрыя закуты,
Люты дзьме ў жалейку пачуцця.

# А ТЕПЕРЬ МЫ СОСТАВИМ ПРОТОКОЛ!

НЕТ, ЭТО НЕ СОВЕТЫ ПО ОБЩЕНИЮ С ИНСПЕКТОРАМИ ГАИ. И НЕ РЕКОМЕНДАЦИИ ПО ВЫБОРУ ЖИЛЕТА ДЛЯ ПРОИЗНЕСЕНИЯ НОБЕЛЕВСКОЙ РЕЧИ. ЗДЕСЬ НАПИСАНО, КАК НЕ ПОСТРАДАТЬ ПРИ СТОЛКНОВЕНИИ КУЛЬТУР.

Мы такие разные, но все-таки мы вместе. Хоть и пытаемся время от времени разлететься с этой планеты то на Марс, то на Луну, то туристом на Международную космическую станцию. Но иногда мы встречаемся, и из этих встреч нужно выйти без потерь. Чего не стоит делать русскому человеку, чтобы не шокировать японца или шведа? Чего при встрече не должны смущаться мы сами? Вот наши рекомендации по столкновению цивилизаций. Краткий недипломатический протокол.

## ВЕЩИ, ДЕЛАТЬ КОТОРЫЕ КАТЕГОРИЧЕСКИ НЕ РЕКОМЕНДУЕТСЯ:

Показывать египтянину большой палец в знак того, что все замечательно. Это очень неприлично. Мы затрудняемся предсказать вашу дальнейшую судьбу.

Махать греку рукой при расставании. Он решит, что вы его посылаете очень далеко. Если вы еще и покажете ему большой палец, что означает просьбу заткнуться, мы вообще умываем руки.

Показывать кукиш японцу. Этим жестом японские проститутки когда-то подзывали своих клиентов.

Находясь в Израиле, громко звать жену или подругу по имени Алла. У вас могут быть большие неприятности. Не дожидаясь, пока вы выкрикнете "акбар", вас скрутят как арабского террориста. И людей можно понять.

Расспрашивать австралийца о его предках. В стране, где значительная часть населения — потомки ссыльных каторжников, это попросту бестактно.

## ВЕЩИ, КОТОРЫХ ЛУЧШЕ НЕ ДЕЛАТЬ:

Будучи в гостях у итальянца, пытаться разуваться и просить тапочки. Приносить цветы тоже не стоит. В южной Европе цветы просто так не дарят. В основном на похороны.

Спрашивать дорогу у болгарина. Как известно, у болгар знак отрицания — кивание, знак согласия — мотание головой. А если еще при этом болгарин, имея в виду "да, вам направо", отрицательно мотает головой и говорит "прямо"... мы за вашу голову не отвечаем. "Прямо" по-болгарски — это "право".

Дарить китайцу часы, зонтик или зелёную шляпу (если вам это почему-то придет в голову): часы — из-за созвучия слову "конец" (смерть), зонтик — из-за созвучия слову "разлука". Ну а "носить зелёную шляпу" — означает то же, что у нас "носить рога".

В Италии открывать на всю мощность кран, на котором написано "caldo". По-итальянски это означает "горячий", а не "холодный".

Даже мужчинам надевать шорты в южных мусульманских странах. Поскольку этот предмет одежды очень напоминает арабское нижнее белье.

Сморкаться, даже в чистый и накрахмаленный носовой платок, при корейце. Ему станет дурно. На людях в Корее такого не делают.

## НЕ СТОИТ ПРОИЗНОСИТЬ ВСЛУХ:

— слово "чуть-чуть" — в Индии
— слово "ам" — в Узбекистане
— в некоторых славянских странах — слово "спички"
— фамилию фигуристки Витт — в Эстонии
— и певца Бюль-Бюль-оглы — в Израиле

Эти созвучия тесно связаны с анатомией человека. Первые четыре — с женской анатомией.

## НЕ УДИВЛЯЙТЕСЬ, ЕСЛИ:

В Голландии вы услышите в свой адрес хриплое "Хуеморе!". Это вам желают доброго утра.

После выступления на научной конференции в Германии слушатели вдруг застучат кулаками по столу. В немецкой академической среде именно так, а не аплодисментами, принято выражать свое восхищение.

Голландец, общаясь с вами, постучит себя пальцем по лбу. Как ни странно, он говорит, что вы очень умный.

В Израиле и Италии ваш собеседник станет неприличным образом почесываться. Так принято, ничего страшного.

Японец начнет отмахиваться от вас ладонью, как от надоедливой мухи. Таким способом он просит, чтобы вы к нему подошли.

В Израиле вы услышите в самом неожиданной ситуации одно из русских названий мужского полового органа. Это всего-навсего слово "девочка" на иврите. Другой синоним этого слова, как известно, в Китае имеет множество значений. Вообще, так называемых лингвошокирующих (русскоязычного человека) фраз довольно много в китайском, испанском, иврите, арабском и турецком языках.

## ЕСЛИ ВЫ ДАМА:

На севере Европы даже после романтического ужина кавалер покажет вам счет. Не обязательно придется по нему платить, но вы должны продемонстрировать готовность это сделать.

Даже самый галантный итальянец никогда не подаст вам пальто и даже не поймет, чего вы от него хотите. Зато он может рассказать вам о своих пищеварительных проблемах и сложных взаимоотношениях с какой-нибудь едой. Это светская беседа, рангом не ниже той, что о погоде.

В Италии мужчина вас не пропустит вперед. Открыв ресторанную дверь, он обязан пройти туда первым — а вдруг внутри неприятно, дерутся, плохо пахнет? Тогда даме вообще незачем туда заходить.

## В ПРОШЛОЕ УШЛИ НЕКОТОРЫЕ ПРЕКРАСНЫЕ ОБЫЧАИ

Рассказывают историю о том, как в начале прошлого века в одну из европейских стран прибыл некий африканский посол. Обильно поев на званом обеде, он подозвал слугу, тот подбежал с каким-то сосудом, и посол при помощи нехитрых манипуляций все съеденное прямо над столом отправил в сосуд. В его стране это означало "У вас все настолько вкусно, что я готов съесть обед еще раз!".

Но теперь, подумала, наверное, принимающая сторона, мы составим протокол!

**Газета.Ru**

*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! (Ф. Багушэвіч)*

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 1 САКАВІКА



1 сакавіка 1933г. пакінуў гэты свет адзін з любімых беларусамі паэтаў – **Уладзімір Жылка.** Паводле адной тэорыі, у беларусаў ёсць паэты вялікія, такія, як Купала і Колас, і любімыя, такія, як Максім Багдановіч. Бясспрэчна, да другіх належыць і Жылка. Трагічны лёс, фантастычныя вершы, вялікая будучыня. Некалі імем гэтага паэта будуць называць вуліцы ў беларускіх гарадах. А яшчэ ён – аўтар надзвычай тонкіх паэтычных рэфлексіяў пра Вільню, горад, які моцна любіў і ў якім марыў быць пахаваны.

Бывай, мой ранак срэбнаросы!
Бывай, мой дзень клапот, пакут!
Прайшоўшы свет раздзетым, босым,
Пара падумаць і пра кут:
На могілках зацішных Росы
Хачу спачыць ад каламут.
Сачыцьмуць мой спакой найпільней
Муры старой, каханай Вільні.

### 2 САКАВІКА



2 сакавіка 1608г. памёр **Канстанцін Астрожскі,** выдатны ваяк, пераможца расейскіх захопнікаў у бітве пад Воршай. Астрожскі вядомы не толькі вайсковымі справамі. ¨н – фундатар цэркваў. Збудаваныя на ягоныя грошы храмы і дагэтуль стаяць у старой сталіцы Вялікага Княства Літоўскага – Вільні.

### 5 САКАВІКА

5 сакавіка 1896г. прыйшоў на свет самы савецкі беларускі пісьменнік і навуковец **Кандрат Крапіва,** якога кожны беларус са школы ведае як таленавітага байкапісца.

### 15 САКАВІКА

15 сакавіка 1994г. была прынятая **Канстытуцыя РБ.** Першая канстытуцыя незалежнай Беларусі. Менавіта тая канстытуцыя ўводзіла ў краіне пасаду прэзідэнта, але не давала ніякіх гарантый ад аўтарытарнай мадэлі ўлады. Памылка выявілася неўзабаве. Прыйшоўшы да ўлады ў тым самым 1994 годзе, Аляксандр Лукашэнкаператварыў прававую дзяржаву ў адзін вялікі саўгас і сканцэнтраваў усю ўладу ў сваіх руках, змяніў пад свой густ усё, у тым ліку і канстытуцыю, чым працягнуў свае паўнамоцтвы на два гады.

### 22 САКАВІКА

22 сакавіка 1864г. у Вільні на Лукіскім пляцы мураўёўцы павесілі **Кастуся Каліноўскага**. Цяпер на месцы гібелі змагара ёсць мемарыяльная табліца. Але дакладнае месца пахавання Каліноўскага невядомае. ¨сць звесткі, што магіла яго – недзе ў замкавай Гедымінавай гары. Нібыта яшчэ ў міжваенны час удзячныя нашчадкі паставілі на тым месцы крыж. Але цяпер ад таго крыжа не засталося ані знаку.

# "ИБО Я ТЕБЕ ИЗ-ПОД ВИСЕЛИЦЫ ГОВОРЮ, НАРОД..."

## РАЗМЫШЛЕНИЯ ПО ПОВОДУ СКОРБНОЙ ДАТЫ

**В СВЯЗИ СО 140-Й ГОДОВЩИНОЙ КАЗНИ НАЦИОНАЛЬНОГО ГЕРОЯ КАСТУСЯ КАЛИНОВСКОГО ОДИН ИЗ ЛИДЕРОВ ПАРТИИ БНФ ЮРИЙ ХОДЫКО ОПУБЛИКОВАЛ СВОЕ ЭССЕ. ПРЕДЛАГАЕМ ЕГО ВАШЕМУ ВНИМАНИЮ.**

Есть герои дня, месяца, года. Есть герои эпохи. Эпические герои — люди, память о деяниях которых живет в веках. Для этого они должны оставить в истории народа яркий и глубочайший след. Такой след в истории Франции покинула Жанна д'Арк. Таким же героем для Беларуси является Константин Калиновский.

Сын бедного шляхтича с Гродненщины, выпускник юридического факультета Петербургского университета, он только весной 1861г. вернулся на родину. Три оставшиеся года его жизни были посвящены подготовке, участию и, наконец, руководству национально-освободительным восстанием 1863-64 гг.

Это была тяжелая неравная борьба. Царское правительство бросило на подавление "польского мятежа" более 300 тыс. солдат и казаков, поддержанных более чем тремя сотнями орудий. А повстанцы часто были вооружены только косами, переделанными в пики. Успешное вначале восстание постепенно затухало, поскольку из Франции и Англии не поступило обещанного оружия. Потоки крови молодых борцов за свободу и социальную справедливость гасили пламя восстания. 29 января 1864г. в Вильне был схвачен и Кастусь Калиновский. После короткого "дознания" он был 22 марта публично казнен на рыночной площади. Всего было повешено около тысячи участников восстания. Десятки тысяч высланы в Сибирь.

Идеями национального самоопределения, социальной справедливости была пропитана политическая атмосфера Европы в шестидесятые годы XIX столетия. В 1861г. закончилось политическое воссоединение Италии в результате героического похода "тысячи Гарибальди". В том же году вспыхнула гражданская война в Северной Америке за ликвидацию рабства. На этом фоне половинчатый Манифест Александра II об уничтожении крепостничества только усилил чувство неудовлетворения национальной и социальной политикой царского режима в западных областях Российской империи. Жестокая расправа над восставшими не решила этих проблем, а только породила новые. Она спровоцировала террор "Народной воли". Именно бомбой, брошенной земляком Калиновского Игнатом Гриневицким, был убит в марте 1881г. палач восстания Александр II.

Долговременные последствия этого восстания заставляют внимательно присмотреться к небольшому, но идейно богатому наследию К.Калиновского, отраженному в его "Мужыцкай праўдзе". Он стал первым белорусским революционным демократом, который хотел превратить классово ограниченное шляхетское восстание во всенародное. Он горячо выступал за права мужиков на свободу, землю и национальную самобытность. Он стал предвестником национального суверенитета Беларуси, хотя и называл ее еще Литвой. Именно поэтому после сорокалетнего запрещения на все национальное, как пламя из-под пепла взорвалось и разгорелось первое белорусское Возрождение.

Есть что-то мистическое в том, что дата смерти К.Калиновского – 22 марта – практически совпадает с датой провозглашения БНР — 25 марта. Только в 1991г. исполнилась мечта Калиновского о восстановлении государственного суверенитета его родины. Хотя еще не исполнилось целиком его пророчество: "Ибо я тебе из-под виселицы говорю, Народ, что тогда только заживешь счастливо, когда над тобою Москаля уже не будет".

Защищая и укрепляя суверенитет Беларуси, не должны мы забыть имя человека, принесшего на алтарь нашей свободы свое пламенное сердце 140 лет назад.

**Юрий ХОДЫКО**

# ВЕРШ НА СВАБОДУ

**Славамір АДАМОВІЧ**

**Не для гномікаў партыі -**
**для сябе здабываю свабоду.**
**Жыву, як заўсёды, упарта я,**
**зьнішчаю плябейства пароду.**

**Свабода мая ня кніжная,**
**ня тая, калі ўсё, што хочацца**
**можна рабіць і пыжыцца,**
**і лярвай у ложку варочацца.**

**Свабода мая вызвольная**
**ваўчыцай цяжка параненай**
**выходзіць з лагва падпольнага**
**і ўецца незаарканенай.**

**Свабода мая беларуская**
**крывёю чыстай крывавіцца**
**і стужкай вузенька-вузкай**
**сьцякае па белай правіцы...**

**Уладзімер АРЛОЎ**

**У спакоі тваіх вачэй,**
**у смаку тваіх сьлёз,**
**у таемнасці тваіх слоў,**
**на дне твайго маўчаньня,**
**на ўзьмежках спатканьняў і ростаняў,**
**у плыні рэк і аўтастрадаў,**
**на вуліцы Ніжнепакроўскай у Полацку**
**і на бэрлінскай Unter den Linden,**
**на старонках старых фаліянтаў**
**і над вокладкамі новых кніг,**
**у палёце птушак**
**і ў сьпевах марцовых катоў,**
**у вершах і нэкралёгах,**
**у водары тваёй парфумы**
**і ў глыбінях твайго лона -**
**паўсюль сачу знакі таго,**
**што павінна зьдзейсьніцца**
**у гэтым стагодзьдзі,**
**паўсюль –**
**дзень пры дні – сачу знакі**
**Нашай Свабоды.**

# У НАС НЯМА ДВАРАН

## 22 САКАВІКА – 140 ГОД СА СМЕРЦІ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА

*Мятеж прошёл, крамола ляжет,*
*В Литве и Жмуди мир взойдёт;*
*Тогда и самый враг твой скажет:*
*Велик твой подвиг… – и вздохнёт…*

**Н.А.Някрасаў. Ода М.Мураўёву.**

ЛЕСВІЦА. КАНВОЙ. ШВОРАК. ПЯТЛЯ. І ВАРОНЫ, БЕЗЛІЧ КАШЛАТЫХ ГРУГАНОЎ У ШЭРЫМ ВІЛЕНСКІМ НЕБЕ, ШТО ВОСЬ-ВОСЬ ЗРЫНЕ ЎНІЗ ПРОЦЬМУ НАЙЧЫСЦЕЙШЫХ У СВЕЦЕ СЛЁЗ.

Так 140 год таму, 22 сакавіка 1864 года беларуска-ліцьвінскае быд..., даруйце, грамадства развіталася са Збаўцам. Надта ж цікава было пазіраць, як заторгаецца, заскача ў пятлі, накінутай непазбежнай рукою ката, такое блізкае, роднае, Чалавечае сэрца. Вельма ж хацелася пачуць фатальны хруст шыйных пазванкоў.

Яны ж гуманныя, гэтыя маскальскія суддзі, яны ж накідваюць на галаву ахвяры мяшок, каб не было відаць, як раптоўна выбухаюць жылы на ілбе, спакваля чырванее, а пасля сінее ажно да чарнаты аблічча яшчэ нядаўняй запаветнай мары Марыські. Як скрозь напачатку выбітыя на допытах, а пасля скрышаныя сілаю ўласных сківіцаў зубы, што яшчэ паўтара месяцы таму зіхацелі ў засмучонай і стомленай усмешцы маладым паўстанкам, вывальваецца чорны язык.

З гэтых вуснаў паўтары хвіліны таму вырваліся словы, што пасля, праз стагоддзе і болей, падхопяць ды разнясуць аўтары амаль усіх "тожэ-беларускіх" школьных падручнікаў па гісторыі Айчыны.



Гэты партрэт Кастуся Каліноўскага зрабіў у 1862г. яго паплечнік Ахіл Барнольдзі.




Карыкатура 1898г. на адкрыццё ў Вільні помніка генерал-губернатару М.Мураўёву, заўзятаму праваднiку расейскай каланiяльнай палiтыкi ў Беларусі.

"У нас няма дваран, у нас усе роўныя…"

Сын хай сабе і збяднелага гарадзенскага шляхціча, кандыдат юрыдычнага факультэта Пецярбургскага унівэрсітэта, аўтар "Мужыцкай праўды", ён выразна бачыў розніцу паміж паняццямі "дваранства" і "шляхта". Насамрэч, "дваран" на Літве не было спрадвеку. Была шляхта. І шляхта была роўнаю. І ўзнялася. І супрацьстала. І бараніла Айчыну.

Ад таго самага "дваранства".

А вакол моўчкі стаяў натоўп. Той самы, каму былі адрасаваныя "Лісты з-пад шыбеніцы". Той самы, сярод якога так адзінока было Марысьцы. Так адзінока, што яна абрала смерць, бязлітасную і пакутніцкую, абы толькі не быць сам-насам з імі.

Без Яго.

Пасля яны стрывалі "палітыку шворка" Мураўёва-Вешальніка і на памяць завучылі ягоныя "несмяротныя" словы: "Што не зробіць рускі штык, дакончыць руская школа". Перад гэтым яны скарыліся сувораўскім "чудо-богатырям" і нават пабудавалі музей іхняму правадыру. І яны ж з дзікай радасцю ў шалёных вачах будуць на ўсіх будынках уздымаць чырвоныя сцягі.

Яны.

Беларусы.

Народ…

Народ чакае на Збаўцу.

**Сяржук ГАЎРЫЛЕНКА**

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 22 САКАВІКА



22 сакавіка 1943г. гітлераўцы спалілі беларускую вёску **Хатынь** разам з людзьмі. А была гэта невялікая вёска, 26 двароў.

Учыніў экзэкуцыю карны атрад эсэсаўцаў обэрштурмбанфюрэра Аскара Дзерлівангера. У агні згарэлі 149 хатынцаў, у тым ліку 75 дзяцей. Сёння на месцы спаленай вёскі збудаваны мемарыял. Хатынь – адна з многіх спаленых у вайну беларускіх вёсак. ¨сць меркаванне, што менавіта яна абраная за сімвал, бо яе назва сугучная з назваю Катыні на Смаленшчыне, дзе савецкія карнікі знішчылі тысячы польскіх афіцэраў. І зроблена гэта было, каб заблытаць звесткі – хто дзе калі і каго забіваў – і такім чынам зацерці праўду пра трагедыю Катыні.

Трэба мець на ўвазе, што і за афіцыйнай легендай хатынскай трагедыі застаецца шмат няяснага. Гадоў дзесяць таму, калі паадкрываліся архівы, у друк патрапілі звесткі пра тое, што хатынцаў спалілі не немцы, а карны ўкраінскі батальён. Сталі вядомыя і некаторыя дэталі трагедыі. Напярэдадні здарэння савецкія партызаны на дарозе каля Хатыні забілі нямецкага афіцэра, любімчыка Гітлера. Вось жа спаленне вёскі фашыстамі было наўпрост справакаванае так званымі народнымі мсціўцамі...

Так ці інакш, а поўная праўда пра хатынскую трагедыю яшчэ не распаведзеная. Бясспрэчным застаецца і застанецца толькі факт злачынстваў, якім не будзе тэрміну даўнасці.

### 28 САКАВІКА



28 сакавіка 1985г. пакінуў гэты свет **Марк Шагал,** знакаміты беларускі мастак.

Нарадзіўся ён 7 ліпеня 1887г. у Віцебску дзевятым у сям’і. Яго бацька працаваў на складзе, дзе капцілі сялёдку, а маці трымала лаўку, у якой прадавалася гэтая самая сялёдка. Тым не менш, з хлопца выйшаў выдатны, сусветна вядомы творца, большая частка жыцця якога прайшла, на жаль, па-за межамі Беларусі.

Прыняўшы бальшавіцкі пераварот з энтузіязмам (быў нават два з паловай гады камісарам па культуры ў Віцебску, адкрываў музеі і школы), у хуткім часе расчараваўся ў камуністычнай ідэі і эміграваў.

Жыў ён і ў Берліне, і ў Парыжы, і ў Нью-¨рку. Быў двойчы жанаты. А пайшоў з жыцця на французскай Рыв’еры, дзе жыў апошнія гады.

**Гістарычны сектар**

## ЗАСПЯВАЕМ!

«ДЗЕДЗІЧ» ПРАЦЯГВАЕ ПУБЛІКАВАЦЬ ТЭКСТЫ НАЙБОЛЬШ ПАПУЛЯРНЫХ БЕЛАРУСКІХ ПЕСЕНЬ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЛЮБІЦЬ АДПАЧЫВАЦЬ ПАД ЗВОН ГІТАРЫ. А ТЫМ, ХТО ЖАДАЕ НАБЫЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МУЗЫКУ, РАІМ ТЭЛЕФАНАВАЦЬ У РЭДАКЦЫЮ.

# МАЯ КРАІНА

Novaje Nieba
(Падбор акордаў - Тася)

Am F
Я люблю, калі сьвеціць сонца
Dm E
Рана ранкам праз фіранкі
Я люблю пах сьвежае кавы
Я люблю пах смажанай бульбы
Мне падабаецца дым цыгарэтаў;
Мне падабаецца водар парфумы
Я люблю халодныя блюзы
Я люблю свае джынсы старыя
Я жыву ў гэтай Краіне
Мая Краіна пад белым сьнегам
Мая Краіна пад белым сьцягам
Пад белым сьцягам з чырвонай стужкай

Я зь цягам часу стануся птушкай
Раскіну крылы, зраблю тры крокі
І падымуся па-над зямлёю
Туды, дзе вецер і дзе аблокі
Над Краінай пад белым сьнегам
Над Краінай пад белым сьцягам
Пад белым сьцягам з чырвоной стужкай

Мая свабода
Мая свабода – зь ветрам нязгода
Ды асалода супрацьстаяньня
Мая свабода – човен падводны
Паміж Сцылаю ды Харыбдай
Мая свабода – дом папяровы
Паміж Гамораю ды Садомам
А там за домам край невядомы
Пад белым сьнегам пад белым сьцягам

Зь цягам часу складанымі сталі
Законы гульні
А неяк раней усё проста было
І мы былі;
Мы проста ішлі мы проста стаялі
Мы проста жылі і паміралі
У сваіх дамох папяровых
У сваіх падводных чоўнах
Паміж Сцылаю ды Харыбдай
Паміж Гамораю ды Садомам

У Краіне пад белым сьнегам
У Краіне пад белым сьцягам
У Краіне пад белым сьнегам
У Краіне пад белым сьцягам
Пад белым сьцягам з чырвонай стужкай

## СМАЧНА ЕСЦІ!

# САЛОДКІЯ СТРАВЫ І НАПОІ

### ЧАРНАСЛІЎ У МАЛАЦЭ

*80 г чарнасліву, 4 шклянкі малака, 2 ст. лыжкі цукру.*

Чарнасліў прамыць, заліць кіпячым малаком і настойваць 1-1,5 гадзіны. Затым пакласці цукар і паставіць у духоўку, каб на паверхні малака ўтварылася румяная пенка.

Чарнасліў у малацэ падаецца як гарачым, так і халодным.

### ЧАРНАСЛІЎ, ФАРШЫРАВАНЫ ТВАРАГОМ

*300 г чарнасліву, 100 г тварагу, 1 яйка, 2 ст. лыжкі цукру, 1 ч. лыжка сметанковага масла, 100 г смятаны.*

Чарнасліў прамыць, заліць невялікай колькасцю гарачай вады, і пакінуць пад накрыўкай для набухання. Затым выняць з чарнасліву костачкі.

Працёрты тварог змяшаць з яйкам і цукрам. Чарнасліў напоўніць тварожнай начынкай, выкласці на патэльню, заліць смятанай і запячы ў духоўцы.

Пры падачы на стол паліць распушчаным маслам.

### КУЛАГА

*400 г чарніц, 70 г мёду, 2-3 ст. лыжкі жытняй мукі.*

Свежыя чарніцы (брусніцы, буякі, маліны) перабраць, прамыць, паставіць на агонь.

Калі ягады разварацца, дадаць жытнюю муку, разведзеную ў невялікай колькасці вады, мёд (або цукар), перамяшаць і варыць на слабым агні, пакуль страва не набудзе кансістэнцыю кісялю.

Кулагу падаць з блінамі (хлебам) і малаком.

### ЧАРНІЦЫ З МАЛАКОМ

*3 шклянкі чарніц, 1 л малака, 2 ст. лыжкі цукру.*

У талеркі наліць халоднае малако, усыпаць прамытыя чарніцы.

Асобна падаць цукар (або мёд).

### ЯБЛЫКІ, ПЕЧАНЫЯ З БРУСНІЦАМІ

*8 яблыкаў, 1 шклянка брусніц, 0,5 шклянкі цукру, 2 ст. лыжкі цукровай пудры.*

Яблыкі памыць, выдаліць асяродак. Паглыбленне запоўніць брусніцамі, змешанымі з цукрам. Падрыхтаваныя яблыкі пакласці на бляху, падліць трошкі вады, каб яблыкі не палопаліся, і запячы ў духоўцы.

Пры падачы на стол пасыпаць цукровай пудрай. Да печаных яблыкаў можна падаць малако.

### ЯБЛЫКІ, ФАРШЫРАВАНЫЯ ТВАРАГОМ

*4 яблыкі, 100 г тварагу, 1 ст. лыжка цукру, 3 яйкі, 4 ст. лыжкі сочыва, ванілін або карыца.*

Яблыкі памыць, выдаліць асяродак. У працёрты твароог дадаць 2 яйкі, расцёртыя з цукрам, ванілін або карыцу, старанна перамяшаць. Гэтай масай запоўніць яблыкі, паверхню фаршу змазаць узбітым яйкам. Пакласці яблыкі на патэльню, падліць трошкі вады і запячы ў духоўцы.

Пры падачы на стол яблыкі паліць сочывам.

### КІСЕЛЬ З ЖУРАВІН

250 г журавін, 6-8 ст. лыжак цукру, 4-6 ст. лыжак крухмалу.

Журавіны перабраць, прамыць, працерці праз сіта, адціснуць сок. Жамерыны заліць гарачай вадой (6-7 шклянак), давесці да кіпення, працадзіць. Частку адвару ахаладзіць, развесці ў ім крухмал.

У адвар, што застаўся, пакласці цукар, закіпяціць яго, затым уліць разведзены крухмал, адціснуты сок і давесці да кіпення.

Гатовы кісель разліць у кубкі, пасыпаць цукровым пяском, каб не ўтварылася плеўка, і ахаладзіць.

### БЯРОЗАВІК

*5 л бярозавага соку, 30 г ячменю.*

Бярозавы сок заліць у драўляную бочачку, паставіць у цёмнае халаднаватае месца. Праз 2-3 дні, калі сок трошкі закісне, дадаць ячмень, падпражаны на бляхе, або жытнія сухары, даць пастаяць яшчэ суткі, працадзіць.

Аналагічным чынам гатуецца і кляновы квас-кляновік.

### МЕДАВУХА

*5 л вады, 300 г мёду, 10 г дражджэй.*

Мёд разам з сотамі развесці ахалоджанай гатаванай вадой, заліць у невялікую драўляную бочачку. Дадаць дрожджы, разведзеныя ў цёплай вадзе, перамяшаць.

Вытрымліваць у халаднаватым месцы 6-8 дзён.

**Беларуская Палічка (http://knihi.com)**

# ПРЫЙДЗЕ ЧАС...

ПРЫЙДЗЕ ЧАС, КАЛІ ВЫКЛАДЧЫК ГЕАГРАФІІ АБО ФІЗІКІ, УВАХОДЗЯЧЫ Ў КЛАС, БУДЗЕ КАЗАЦЬ ДЗЕЦЯМ НЕ "ЗДРАВСТВУЙТЕ", А "ДОБРЫ ДЗЕНЬ"; КАЛІ ЗАМЕСТ ШЫЛЬДАЎ З ПОДПІСАМ "МАГАЗИН" БУДЗЕ КРАСАВАЦЦА НАДПІС: "КРАМА"; КАЛІ ДЗЯРЖАЎНЫ СЦЯГ НАШАЙ КРАІНЫ БУДЗЕ НАГАДВАЦЬ НАМ НЕ ПРА ТЫСЯЧЫ РАССТРАЛЯНЫХ І РЭПРЭСАВАНЫХ ЖЫХАРОЎ БЕЛАРУСІ, А ПРА СЛАЎНАЕ І ГЕРАІЧНАЕ МІНУЛАЕ НАШАЙ РАДЗІМЫ.

І прычынай гэтаму ўсяму будуць людзі, – людзі, якія не забылі і не адракліся ад сваёй Бацькаўшчыны; людзі, якія з малаком маці ўвабралі ў сябе любоў да ўсяго беларускага і да Беларусі. Людзі, для якіх "у векавечнай бацькаўшчыне клёны" будуць даражэй за жыццё.

І гэта – не ўтопія, гэта – не мара пра нацыю, якая будзе гаднейшая або вышэйшая за ўсе краіны і народы – не, гэта – вера ў Беларусь. І гэтая вера надта ж нагадвае белы неабсяжны рамонкавы акіян, на якім доўгай і на дзіва роўнай касой чырванеюць макі.

Зямля Беларусі заўжды была багата на людзей, якія ахвяравалі жыццём дзеля Вольнасці, Мовы і Шчасця Бацькаўшчыны. Зараз пра іх пішуць: "¨сць, дзякуй Богу, і цяпер каму павесці за сабою". А амаль сто гадоў назад Янка Купала пісаў: "Жылі і паміралі на стражы Беларушчыны... Паміралі: палаючы да апошніх скону хвілін вялікай святой ідэяй, і гэтая праца... лепшых беларускіх людзей над падняццем свае роднае культуры не была дарэмнай!"



Аналізуючы мінулае, гледзячы наперад, хочацца сказаць толькі адно: "І ўсё ж мы дойдзем да Беларусі".

**P.S.** Пры напісанні артыкула выкарыстаны цытаты з твораў: "У векавечнай Бацькаўшчыне клёны..." Ул.Караткевіча; "Прысвячэнне У. Калесніку" А.Каско; "Выбранае" Я.Купалы.

**А. ЛЯЎЧУК**

ВЯРТАННЯ МАЎКЛІВАЯ СПОВЕДЗЬ

# TABULA RASA* БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***"Я вывучаў іх (незразумелыя словы ў Лемантары - А.Л.) і хацеў, каб такіх слоў было як найбольш... Гэтак і стаўся беларусам. Адсюль і пачалася мая дарога да беларушчыны. Яна ішла праз Саматэвіцкую сямігодку, праз Педтэхнікум ў Асмалаўі... праз турму, праз Калыму, але найперш за ўсё - праз вершы..."***

**Майсей Сяднёў. Ліст да Г.Тварановіч ад 01.12.2000г**

## I. ЗАМЕТ ЭПІГРАФА

Таталітарызму не патрэбны іншадумцы – гэты тэзіс за сямідзесяцігоддзе чырвонага тэррору і ахлакратыю постсацыялістычных гадоў добра, так бы мовіць "на ўласнай скуры" адчула беларуская інтэлігенцыя XX і XXI стагоддзяў: Гарэцкі, Аляхновіч, Гартны, Салавей, Арсеннева, Геніюш, Быкаў... – спіс можна доўжыць бясконца. Але ён будзе няпоўным без імя Майсея Сяднёва, чалавека, які Бацькаўшчынай "гнаны за беларускасць" у 2001г. памёр у далёкай Амерыцы, так і не атрымаўшы прызнання сваёй Радзімы. Калі быць дакладным, то намаганні, звязаныя са спробай вярнуць беларускай літаратуры прозвішча Сяднёва былі: у перыяд Адраджэння (1990-х гг.) у новых падручніках па беларускай літаратуры для сярэдніх школ пабачылі свет вершы Майсея Сяднёва, але, у наступных выданнях, разам з вершамі Геніюш і Арсенневай, за "несоответствие идеологическому курсу" бруднымі рукамі менскіх чыноўнікаў былі выкрэслены з літаратурнай спадчыны Беларусі.

## II. CURRICULUM VITAE

Нарадзіўся Майсей Ларывонавіч Сяднёў 1 верасня 1915г. у вёсцы Мокрае Магілёўскай вобласці. Паступіў у Менскі педінстытут, аднак у 1936г. быў абвінавачаны ў нацдэмаўшчыне і сасланы на Калыму. Напярэдадні восені 1940г. вязняў, у тым ліку і Сяднёва, прывезлі ў менскую турму (для перагляду справы) дзе іх і застала вайна. У чэрвені нямецкія самалёты разбамбілі турму, дзе супрацоўнікі НКУС метадычна катавалі і забівалі зняволеных беларусаў. Аб гэтых падзеях яскравей за самога аўтара кажуць толькі ягоныя творы. У вершы "Параніла сябе густая ноч" знаходзім:

... Турма. Як бляск вар'яцкіх воч,
у вокнах б'ецца жах...

Цялячы крык упаў на брук
І – лужына крыві.
І нейчы голас: пальцы рук
сьціскай мацней, даві!

Заплакаў брук на гэты грэх,
крывёю – капяжы.
Яны, сцякаючы са стрэх,
застылі ў нажы...

Аналізуючы гэты верш, М.І. Мішчанчук у брашуры "Чатыры партрэты беларускіх паэтаў-эміґрантаў" піша: "Трагедыйным вобразам-дэталлю з'яўляецца вобраз – параўнанне жаху ў вокнах з бляскам вар'яцкіх воч... У наступных строфах адчуванне жаху ўзмацняецца яшчэ больш: паказваюцца за працай каты, што трушчаць чалавечыя пальцы, пакідаючы пасля сябе крывавыя лужыны, і, нават, нежывое – той самы турэмны двор – не вытрымлівае выпрабавання болем і пакутамі жывых – ён плача "за гэты грэх"...

Ратуючыся ад камуністычнага молаху з першых год вайны Сяднёў выязджае на эміграцыю. Напачатку жыве ў Берліне, а з цягам часу ад'яжджае ў Глен Коў (ЗША), дзе і пражыў да самой смерці. На Беларусі Майсею Сяднёву давялося пабываць толькі аднойчы ў 1990-х гг. Памёр пісьменнік 5 лютага 2001г. па-за межамі сваёй Бацькаўшчыны.

## III. "СТАЛІЦАЮ ГНАНЫ ЗА БЕЛАРУСКАСЦЬ..."

Як ужо адзначалася раней, таталітарызм (будзь ён у постаці Сталіна, або...) не прымае іншадумцаў, таму і Сяднёў, адзін з нешматлікіх пісьменнікаў, якія адважыліся сказаць праўду аб Другой сусветнай вайне, вымушаны



быў цярпець нападкі тагачаснай крытыкі. Асноўным абвінавачваннем пісьменніка было тое, што, быццам бы, Сяднёў радасна вітаў пачатак вайны. У якасці доказа прыводзілі верш "Вызваленне":

Збамбілі ля турмы ўвесь квартал,
і я пайшоў у сьвет раскутым.
Як радасьць для сябе, вайну я прывітаў
радкоў маіх лірычнейшым салютам.

Стаяў такі празрысты дзень, маўляў
на ўзмор'і пенай вымытай салёнай.
Я цэлы сьвет благаслаўляў
затым, што сам я быў благаслаўлёны.

Маліўся сіле агнявой
і дню, што лёс мой перайначыў.
Я самалёту кожнаму над галавой
жадаў найлепшае ўдачы.

Як зьвязаныя ніцямі душы,
і ў лёце ня гублялі яны згоды.
І крыльле іх у сонечнай вышы
гарэла водблескам мае свабоды.

На першы погляд, можна пагадзіцца з думкай Б.Сачанкі, які вінавацiў Сяднёва ў прыхільным стаўленні да Другой сусветнай вайны, у тым, што паэт "як радасьць для сябе..." вітаў яе, але тэзісы, якімі аперыраваў на той момант Сачанка (якія і зараз ва ўжыванні сярод некаторых "літаратуразнаўцаў") не маюць пад сабой рэальнага абгрунтавання. Каб высветліць адказ на пытанне "Чым была вайна для Сяднёва?", трэба вярнуцца да верша "Параніла сябе густая ноч", дзе паэт апісвае жахі камуністычнага зняволення. Цікава, а як мог сустракаць вайну чалавек, якога гэтая вайна выратавала ад пакутлівай смерці? Аналізуючы зборнік "Патушаныя зоры" (1975), у якім змешчаны вышэйпрыгаданы верш "Вызваленне", у кантэксце біяграфічных дадзеных пісьменніка, прыходзім да высновы, што творчасць Майсея Сяднёва "не сведчыць пра паэтава прыманне пачатку вайны і фашысцкай акупацыі як вызваленчага акту, а мае характар канстатацыі фактаў – выбаўленне з-за кратаў..." (М.І. Мішчанчук). У гэтым жа зборніку, некалькімі старонкамі далей, выказваецца аўтарскае непрыняцце вайны: гэта і дзяўчынка, якая чакае свайго бацьку (Цяжкі адказ), гэта і молах-рэйхстаг, які "стаяў... на нашай сьпіне" (З "гістарычных датаў"), гэта і праблема так званага "згубленага пакалення" (Вайна цішыні). Але галоўнае, за што дыктатура не магла (і не можа дагэтуль) прыняць "дарунак" Сяднёва – гэта праўдзівае раскрыццё сутнасці вайны. У паэме "Лірычны дзённік" паэт наступным чынам характарызуе стаўленне да нямецкай і савецкай армій беларускага народа:

Партызаны чырвонаю мольлю
раз'ядалі нутро цішыні.
На млынох сабе хлеб малолі
і жаніліся на тры дні.

- Нам і тыя і тыя - ня мілы ўсе...
- Пэўна, лёс наш сялянскі такі...

Сваёй творчасцю Майсей Сяднёў разбурае накінуты КПСС стэрэатып аб "доблесці" савецкай "арміі-вызваліцельніцы" і "мужнасці" партызан.

Безумоўна, што вартасць творчасці Сяднёва не толькі ў выкрыцці антыгуманнасці таталітарных рэжымаў усіх часоў. Найбольш яскрава свой талент пісьменнік праявіў у інтымнай лірыцы, лірыцы, прысвечанай апісанню мясцін Бацькаўшчыны-Беларусі, філасофскай і абуджальна-патрыятычнай тэматыцы. Лірычны герой Сяднёва па глыбіні ўнутранага свету не саступае героям Багдановіча і Барадуліна, а ў асобных вершах нават і ўздымаецца над імі.

Мэтай артыкулу было не азнаямленне чытача з творчасцю М.Сяднёва, а спроба адказаць на пытанне: "Чаму чалавек, які заслугоўвае на "пачэсны пасаг" між іншымі пісьменнікамі Беларусі, застаецца на перыферыі гісторыі нашай літаратуры?"

## IV. ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

"І мне-б магло нясьціся "брава",
і мне-б маглі зайграць музыкі.
Ды што мне гэтакая слава!.."
М.Сяднёў. Я не паэт

**Андрэй ЛЯЎЧУК**

*) лац. – некранутыя старонкі

# ВТОРАЯ ЖИЗНЬ ПЛАСТИКА

## ЧТО МОЖНО СДЕЛАТЬ ИЗ ПЛАСТИКОВЫХ БУТЫЛОК

ЧАСТО ВОЗНИКАЕТ МНОГО ВОПРОСОВ, КАК ПРИУЧАТЬ ДЕТЕЙ К ЭКОНОМИИ, БЕРЕЖЛИВОСТИ, ОСНОВАМ ЭКОЛОГИИ. ЛУЧШИЙ СПОСОБ – ПОКАЗЫВАТЬ ИМ ПРИМЕР. А ЕСЛИ ЕЩЁ И ВМЕСТЕ ЗАНИМАТЬСЯ ПОЛЕЗНЫМ ДЕЛОМ! ВОТ НЕСКОЛЬКО СОВЕТОВ, КАК ПРИСПОСОБИТЬ ВМЕСТЕ С ДЕТЬМИ ПУСТЫЕ ПЛАСТИКОВЫЕ БУТЫЛКИ.

### ПЛАСТИКОВАЯ БАБОЧКА.

Сделайте из куска картона шаблон бабочки размером 10 х 10 см, наложите его на пластиковую бутылку и обведите контуры карандашом. Вырежьте получившуюся бабочку. Согните пополам и раскрасьте по своему усмотрению. К стене или любой другой поверхности получившийся мотылек крепится легко.

### ОКЕАН В БУТЫЛКЕ.

Наполните бутылку пополам маслом и водой. Добавьте пищевых красителей и блесток. Выглядит довольно неплохо.

### КЕГЛИ.

Заполните бутылку песком. Если несколько таких бутылок поставить в ряд, то получится неплохая трасса для различных игр.

### УКРАШЕНИЯ ДЛЯ ЦВЕТНИКОВ.

Вырезав формы бабочек, птиц или чего-нибудь еще по вашему усмотрению, закрепите их на палках, спицах и т.п. После этого раскрашенные формы можно будет воткнуть в горшки с цветами.

### КОРМУШКА ДЛЯ ПТИЦ.

Зачистите шкуркой и окрасьте пластиковую бутылку в какой-нибудь не очень яркий цвет. Проделайте 4 отверстия в верхней части бутылки прямо под крышкой и просуньте в них два длинных отрезка проволоки так, чтобы они образовали букву "Х". Концы проволоки закрепите в пластиковой крышке, проткнув ими края крышки и загнув их внутрь. Еще два отверстия проделайте в нижней части бутылки на ее противоположных сторонах. Через эти отверстия также просуньте проволоку или леску, чтобы потом кормушку можно было подвесить. Наполните получившуюся кормушку семенами или другим кормом и повесьте на дерево.

### СКВОРЕЧНИК.

Переверните бутылку на бок. В верхней части вырежьте окна или двери будущего домика. Затем окрасьте его или оберните куском материи. Подвесьте на дереве и ждите, когда там поселятся птицы.

### СНЕГОВИК.

Вам понадобится:
- двухлитровая пластиковая бутылка;
- черная и белая акриловая краска;
- губка;
- мелкая шкурка;
- красный и черный фетр;
- клей;
- пластиковый колпачок от большого баллона (например, дезодоранта или освежителя воздуха);
- простая пластиковая крышка.

1. Обработайте шкуркой пластиковую бутылку, колпачок от дезодоранта и пластмассовую крышку. Это позволит краске лучше лечь и закрепиться на пластике.

2. Колпачок от дезодоранта и крышка окрашиваются в черный цвет. Бутылка окрашивается в белый цвет. Дайте краске высохнуть.

3. Бока и верх колпачка, а также верх крышки покройте черным фетром. Так как вы уже окрасили их в черный цвет, нет необходимости быть чересчур аккуратным при наложении фетра на поверхность. Приклейте колпачок к крышке. Это шляпа вашего будущего снеговика. Как только клей высохнет, переверните шляпу и вырежьте ножом небольшое отверстие в пластмассовой крышке. Отверстие должно быть немного меньше окружности верхней части шляпы (колпачка от дезодоранта).

4. Заполните бутылку наполовину гравием или песком. Это не даст вашему снеговику упасть.

5. Отрежьте полоску красного фетра длинной около 50 см и шириной 3-3,5 см (если у вас нет такого длинного куска, отрежьте несколько более коротких полосок и склейте их в одну). Получившуюся ленту обмотайте вокруг бутылки в 7-10 см от горлышка. Закрепите ее на месте при помощи капельки клея.

6. Из подручных материалов сделайте снеговику теплые наушники.

7. Намажьте клеем края отверстия в крышке и прикрепите ее к верхней части бутылки. Украсьте чем-нибудь получившуюся шляпу.

8. При помощи черного маркера или краски нарисуйте снеговику лицо. Также нарисуйте пуговицы. Пуговицы можно изготовить из кружочков черного фетра, приклеив их затем к бутылке.

**Дзмітрый ШАСТАК**

## ЭКА-ЭКСПРЭС

### В БЕЛАРУСИ СОЗДАНЫ ДЕШЕВЫЕ И ДОЛГОВЕЧНЫЕ ФИЛЬТРЫ ОЧИСТКИ ВОДЫ

Их разработали ученые Института механики металлополимерных систем имени В.Белого НАН наук в рамках региональной научно-технической программы Гомельской области.

Изделия, предназначенные для доочистки водопроводной питьевой воды, устраняют посторонние запахи и привкусы, в несколько раз снижают цветность, мутность и окисляемость воды. Кроме того, удаляют из нее оксиды железа и тяжелых металлов, радионуклиды, фенольные производные, остаточный хлор и механические примеси.

По словам авторов разработки, отечественные фильтры выгодно отличаются от зарубежных аналогов — при стоимости на порядок ниже они обеспечивают в 2-3 раза больший ресурс объема очищенной воды. При этом на 30% уменьшены эксплуатационные затраты. На сегодняшний день в лечебных и учебных учреждениях, предприятиях питания Гомельской области установлено около 50 модулей фильтров.

**Dzedzich week-news**

## УВАГА!!!

**БАМГА "Сузор'е" абвяшчае дадатковы набор карэспандэнтаў у склад рэдакцыі ІАБ "Дзедзіч"**

**Студэнтаў, вучняў старэйшых класаў і ўсіх, хто жадае:**
- **Выказаць свае думкі,**
- **Навучыцца пісаць артыкулы,**
- **Зірнуць на акаляючы свет вокам журналіста,**
- **Стаць ля вытокаў стварэння новай моладзевай газеты,**

**просім звязацца з намі па тэл.: 20-57-41 з 18⁰⁰ да 21⁰⁰.**
**Маб.: (029) 660-57-41 (Дзмітрый), (029) 725-15-39 (Андрусь).**
**Таксама запрашаем да супрацоўніцтва мастакоў, карыкатурыстаў, фатографаў.**

БРЭСЦКАЯ ГАРАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

## ПАРТЫЯ БНФ

**распачынае новую агульнагарадскую кампанію "Разам за еўрапейскі дабрабыт".**

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Разам мы:**
- Пабудуем сучасную эфектыўную гаспадарку;
- Усталюем парадак і вяршэнства Закона;
- Адстаім незалежнасць нашай Радзімы;
- Знішчым усеўладдзе і карупцыю чынавенства.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Ты зможаш:**
- Атрымаць кваліфікаваную прававую дапамогу ў складаных жыццёвых сітуацыях;
- Прайсці курсы палітычнай і грамадзянскай адукацыі ў Беларусі і за мяжой;
- Зрабіць кар'еру адукаванага і перспектыўнага палітыка;
- Навязаць кантакты з нашымі партнёрамі ў краінах Еўропы;
- Знайсці новых сяброў, з карысцю для сябе і для Бацькаўшчыны праводзіць вольны час.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ,** каб шчыра казаць сваім дзецям і ўнукам: "Я зрабіў усё, каб ваша жыццё было шчаслівым"!

**Як стаць сябрам партыі БНФ?**
**Тэлефануй: 25-70-55; (029) 641-20-98.**

## АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці.**
**Тэл. (0162) 20-57-41.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці.**
**Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце:**
**(0162) 20-57-41.**

АБ'ЯВЫ

# БІБЛІЯТЭКА ДЛЯ МОЛАДЗЕВЫХ НДА

У памяшканні БАМГА "Сузор'е" адкрылася бібліятэка НДА для прадстаўнікоў маладзевых арганізацый Берасцейшчыны і проста ініцыятыўных людзей. Яна змяшчае кнігі і дапаможнікі па арганізацыі дзейнасці грамадскіх арганізацый.

Карысную літаратуру па рэгістрацыі НДА, арганізацыі справаводства, пошуку фінансавання, працы з валанцёрамі, Public Relations у НДА і шмат-шмат іншай цікавай інфармацыі можна знайсці, звярнуўшыся ў БАМГА "Сузор'е".

Бібліятэка ўтрымлівае таксама літаратуру па наступных раздзелах:

– Выбары (арганізацыя выбарчых кампаніяў, агітацыя, назіранне);

– СМІ (рэгістрацыя і дзейнасць газет, рэкламная дзейнасць, нарматыўна-праваыя акты);

– Правы чалавека (метадычныя дапаможнікі, маніторынг парушэнняў правоў чалавека на Беларусі, міжнародныя акты і інш.);

– Гісторыя Беларусі (навуковыя матэрыялы, падручнікі, папулярная літаратура);

– Мовазнаўства (слоўнікі, дапаможнікі для тых, хто вывучае беларускую мову);

– Бюлетэні, брашуры і часопісы НДА Берасцейшчыны і краіны;

– Замежная літаратура (слоўнікі, кнігі, часопісы, газеты на ангельскай, польскай, украінскай, літоўскай і латвійскай мовах; матэрыялы па краязнаўству суседніх (і не вельмі) краін на беларускай мове);

– Мастацкая літаратура (на беларускай і расейскай мовах).

Бібліятэка чакае наведвальнікаў штодня з $12^{00}$ да $16^{00}$ (акрамя суботы і нядзелі). Заходзьце, не пашкадуеце. Калі патрэбнай вам літаратуры няма (і такое можа здарыцца), супрацоўнікі бібліятэкі дапамогуць у яе пошуку.

**Dzedzich week-news**

# СТАЖИРОВКИ В НИДЕРЛАНДАХ

С июня 2003 года Nuffic реализует новую программу стажировок фонда "The Trust: a foundation for young people". Фонд предоставляет возможность молодым специалистам из России, Беларуси и Украины пройти стажировку сроком до четырех недель в голландской компании или (государственном) учреждении. Сфера деятельности может быть любой: окружающая среда, права человека, социальное обеспечение, образование, средства массовой информации, здравоохранение, культура, менеджмент, экономика и бизнес. Программу финансирует Министерство иностранных дел. Запрос в фонд посылает принимающая организация.

Информацию о возможностях программы можно запросить по электронной почте: trustfoundation@planet.nl

**Dzedzich week-news**

# КОНКУРС САНФОРДСКОГО ИНСТИТУТА ГРАЖДАНСКОГО ОБЩЕСТВА

В рамках программы Joel L. Civil Society Fellows Program Санфордского Института гражданского общества объявляется конкурс стипендий для руководителей неприбыльных организаций, международных НГО, организаций и фондов, которые работают над проблемами общественного развития. Программа предусматривает четырехнедельные занятия в Институте общественной политики.

Программа разработана при поддержке Благотворительной американской организации Atlantic Philanthropies. Находясь в Дюке, стипендиаты представляют свое исследование и работают вместе с факультетом Института по проблемам развития гражданского общества. Участники будут отбираться в соответствии с темой их исследования, а также по их намерениям использовать в своей будущей исследовательской работе предлагаемые Институтом ресурсы.

Проживание и расходы по программе оплачиваются. Кроме того, предоставляется стипендия $6000.

Программа начинается 1 октября 2004 года.

Срок подачи заявок — до 1 мая 2004 года.

Форму заявки на участие в программе можно найти на сайте: http://www.pubpol.duke.edu/centers/civil/index.html

Milissa Markiewicz, Program Director Terry Sanford Institute of Public Policy Duke University

Box 90239 Durham, NC 27708 919-613-7315

E-mail: mmarkiew@duke.edu

Web: http://www.pubpol.duke.edu/

**Dzedzich week-news**

# КАНТАКТУЙ З БМА!

Беларуская музыка на касетах і CD.
Толькі ў нас пастаянныя святочныя зніжкі!

Набудзь пяць дыскаў – шосты атрымаеш задарма!!! Магчыма дастаўка на дом.

Прапануем заробак распаўсюднікам у Менску і рэгіёнах.

Кантактуй з намі: 8 (0296) 49 08 88, pager: 211 85 85 аб. БМА.

220085, г. Менск, а/с 5, wital@tut.by, www.BMA.home.by.

# КУПЛЯЙ БЕЛАРУСКАЕ

Часопісы («Arche», «Дзеяслоў» і інш.), беларускія кнігі, якія не прадаюць у крамах, а таксама беларускамоўнае відэа (Гладыятар, Адважнае сэрца, Матрыца, інш.) і музыка беларускіх выканаўцаў па нізкіх коштах (без гандлёвай надбаўкі). Гэта ўсё цяпер можна набыць у Берасці.

Тэл.: (029) 727-44-83 (Андрусь).

**Dzedzich week-news**

**Фонд «Дзедзіч» шукае добраахвотніка**

## WEB-дызайнера

**(з сярэднім узроўнем валодання WEB-праграмаваннем), які б дапамагаў нам у абнаўленні і ўдасканаленні сайта арганізацыі: http//:dzedzich.vezha.unibel.by.**

**На жаль, мы не можам аплаціць гэтую працу, але каву, гарбату і добрую сяброўскую атмасферу гарантуем.**

**Тэл.: (029 )660-57-41.**

## Беларуская палічка запрашае

**Сябры! Запрашаем Вас наведаць буйнейшую беларускую электронную бібліятэку! Адрас "беларускай палічкі": www.knihi.com.**

Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.

**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

### Шаноўны чытач!

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, пр-т Машэрава, д. 39, кв.4.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго: ______

### Увага!

Працягваецца бясплатная падпіска

**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч" для асоб, што не жывуць у г. Берасці.**

Калі ты жадаеш атрымліваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:

**224000, г.Берасце, пр-т Машэрава, д. 39, кв. 4.**

Чаму ты вырашыў падпісацца: ______

Прозвішча: ______

Імя: ______

Імя па бацьку: ______

Паштовы адрас: ______

Тэлефон: ______

## ДАРЭЧЫ

Жанчыны часам не разумеюць мужчын, таму што мужчыны часам думаюць тым, чаго няма ў жанчын.

***

Дзьве бландзінкі размаўляюць у аэрапорце, разглядаючы Боінг 747:

- Слухай, як жа такую махіну ўганяюць?! Куды ж яе схаваеш?..

- Ты што, дурніца?! Іх жа ўганяюць у небе, калі яны маленькія...

***

- Ты ведаеш, памёр наш шэф!

- Так, я ўжо ведаю. Вось толькі з раніцы ўсё сябе запытваю, хто ж гэта памёр разам з ім?

- Як гэта - разам з ім?!

- У некралозе напісана: "Разам з ім памёр адзін з самых лепшых нашых спецыялістаў!".

***

Боцман вучыць матроса чысціць бульбу:

- Ну, ты зразумеў?!

- Не.

- Ну, пі-і-іп. Ідзі спусціся ў трум, там тормаз. Абдымі яго, гэта твой тата.

***

Настаўніца просіць вучняў распавесці нейкую незвычайную гісторыю.

Вовачка:

- Пазаўчора на лецішчы мой тата ўпаў у калодзеж.

- Божа мой! Я спадзяюся, зараз з ім усё нармальна?

- Ну, я думаю, што так. Прынамсі, учора ён ужо нікога не клікаў на дапамогу.

***

"Рок супраць наркотыкаў" - гэта тое ж самае, што "коні супраць аўса" ці "арабы супраць тэрарызму".

***

Сябра пазнаецца ў бядзе, а сяброўка - на адпачынку.

***

Муж і жонка вячэраюць. Жонка практычна нічога не есць. Муж здзіўлена пытаецца:

- Каханая, што гэта ты нічога не еш?

- Ды ты што - хочаш, каб я раз'елася і стала падобнай на тлустую карову? Гэта ж будзе жахліва!

- Нічога, дарагая, еш... Павер мне - хударлявая карова выглядае не лепш!

***

Пасля таго, як жонка нарадзіла дзявятае дзіця, доктар, які прымаў роды, запрасіў яе мужа і кажа:

- У наступны раз, калі вам вельмі захочацца, спытайце сябе, ці здолееце вы ўтрымліваць яшчэ адно дзіця.

- Дарагі доктар, калі мне вельмі хочацца, у мяне такое адчуванне, што я магу ўтрымаць усю Берасцейскую вобласць!

***

За грошы любы дурань будзе працаваць. А дурні мне на працы не патрэбныя...

***

Яго называлі Паляўнічым на кракадзілаў, таму што яму трапляліся толькі непрыгожыя дзяўчыны.

Фобія Фрэйда: "Фалас Мёбіуса"...

***

Адзін мужык падазрае сваю жонку ў нявернасці. Вырашыў праверыць. Сказаў, што з'язджае на паляванне, а сам схаваўся ў шафе...

Не прайшло і пары гадзін, як сапраўды прыйшоў кабеліна. Жонка стол накрыла, бутэлечку паставіла: сядзяць, выпіваюць. Падпілі крыху, яна і кажа:

- Няма ў нас з мужам дзетак, а так дзіця хочацца паняньчыць! Давай у "дачкі-маткі" пагуляем! Пабудзеш маім сыночкам! Палюбоўнік пагадзіўся, распрануўся. Жонка яго ў прасцінку ухутала, на ложак паклала. Запытвае:

- Што мая дзетачка хоча? Можа, кашкі?

- Хасю каскі! - лапоча "дзетачка".

Жонка на кухню па кашку пайшла, а муж з шафы вылез, двустволкай памахаў і пяшчотна так кажа:

- Што, малец, кашкі захацелася? - і зноў у шафу.

Прыносіць жонка з кухні кашку, лыжку суе, а "дзетка" рожу адварочвае.

Жонка:

- Не хочаш кашкі? Можа, малачка?

Бяжыць на кухню, а муж ізноў з шафы вылазіць і двустволку пад нос "малому":

- Малачка, кажаш, захацеў, крошка? - і зноў у шафу.

Жонка прыносіць малака, а "сынок" зноў галавой верціць, капрызнічае.

Тады жонка кажа:

- Малачка не хочаш... Можа, ціцю даць? Хочаш? І ціцьку не хочаш? Ну-ка, можа, ты апісаўся? - разгортвае прасцінку. - О, дык ты яшчэ і абкакаўся!...

***

Калі вы набываеце плаўленыя сыркі, звяртайце ўвагу на краіну вытворчасці.

Памятайце, што Швейцарыя ніколі не вырабляла сыркі «Волна», «Новость» и «Дружба»!

***

- Ці ведаеце вы, што санкі на сабаках рухаюцца ў два разы хутчэй, калі ў санках сядзіць хаця б адзін карэец?

***

- Паедзем у аквапарк?

- Ага, на метро!

***

Цікава, што насілі б на шыі добрыя хрысціяне, калі б Ісуса з Назарэта не распялі, а пасадзілі на кол?

***

- Вялікі князь, а чаму цябе клічуць "Уладзімір Ясна Сонейка"?

- Та-а-ак... Каб сёння ноччу была ў мяне ў спачывальні! Ясна, сонейка?

***

Мужык раскідвае ўлёткі перад будынкам адміністрацыі прэзідэнта. Міліцыянт убачыў, бяжыць да старэйшага:

- Таварыш маёр, што рабіць будзем?

Пайшлі ўдвух мужыка хапаць. Адну ўлётку паднялі - а там чысты аркуш з абодвух бакоў.

- Мужык, чаго ж ты чыстую паперу раскідваеш?!!

- А што пісаць-та – і так усё зразумела!!!

Мужык заходзіць у бар, замаўляе піва:

- Колькі з мяне?

- Тры даляры.

Мужык вымае з кішэні тры даляры. Адзін кладзе на стойку перад сабой, потым ідзе ў левы канец стойкі, там кладзе другі, потым ідзе ў правы канец стойкі, там кладзе трэці. Бармэн ціха мацярыцца, але ідзе направа-налева і забірае грошы. На наступны дзень ізноў той жа мужык прыходзіць, зноў куфаль піва замаўляе і зноў раскладае даляры ў розных канцах стойкі. Бармэн злуецца, але за грашыма ходзіць. Карацей, такая карціна паўтараецца дзень за днём. І вось аднойчы мужык замаўляе піва, капаецца ў кішэні і дастае паперку ў 5 даляраў. Бармэн хутка гэтую паперку прыбраў, памсліва так пасміхаецца, дастае два даляры рэшты, ідзе ў левы канец стойкі, там кладзе адзін даляр, потым у правым канцы – другі. Затым вяртаецца і зларадна паглядае на мужыка. А той флегматычна высмактаў піва, выцягнуў з кішэні даляр, кладзе яго перад сабой і гаворыць:

- Вазьму-ка я яшчэ адзін куфаль.

***

- Вось гляджу я на цябе і думаю: «Яшчэ выпіць, ці ты мне ўжо падабаешся...».

***

ЗША. Сядзіць наш рэзідэнт з агентам на лаўцы. Той і кажа:

- Паслухай, я табе перадаў сакрэтную інфармацыю! Гэта што, я шпіён?!

Наш супакойвае:

- Ды не, шпіён гэта я... А ты проста здраднік...

***

У пастарунак прыцягнулі п'янага. Той абураецца:

- Я патрабую, каб мне сказалі, чаму вы прывялі мяне сюды?

- Вы дастаўлены сюды як удзельнік п'янага дэбоша, - адказвае сяржант.

- Ну-у, дык гэта мяняе справу! Калі пачынаем?

***

На вуліцы мужык з усёй моцы цягае хлопца за вушы. Ну, проста адрывае, і пры гэтым прыгаворвае:

- Я табе пакажу, як з маёй дачкой спаць, я табе пакажу...

А хлопец ледзь чутна:

- Ды я і сам умею!

***

Набудзь шэсць чабурэкаў – і атрымай шкуру сабакі бясплатна.

***

На ўроку:

- Вовачка! Да дошкі!

- Мар'я Іванаўна, ну вы ўжо занадта самакрытычная!

***

Дэвіз аматараў групавога сэкса: "Інтым не прапаноўваць!".

***

Мужык жаліцца саслужбоўцу:

- Заўтра да мяне прыязджае цёшча... І не адна, а разам з сабакам!

Саслужбовец уздыхае:

- Угу... Сабакі адны ў госці не ездзяць...

№2 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
сакавік 2004

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ

Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 23.03.2004 у $18^{00}$
**Наклад:** 299 асобнікаў. Надрукавана на ксераксе.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Дземідзюк, М. Сімановіч, Д. Шастак, М. Есіна, С. Прылуцкі, С. Камінскі.
**Адказны сакратар:** А. Ляўчук. **Вёрстка:** Б. Дэпеша

**Кантактны тэлефон:** (0162) 20-57-41, (029) 660-57-41
**E-mail:** dzedzich@mail.ru